Нашыя продкі, як сведчаць гістарычныя крыніцы, карысталіся тэрмінам «рэч паспалітая» – у дакументах на беларускай мове і тэрмінам «res publica» – у дакументах на лаціне на працягу амаль усяго існавання Вялікага Княства Літоўскага (ад XIV да канца XVIII стагоддзя), прычым задоўга перад 1569 годам, натуральна ўжываючы яго як сінонім свайго гаспадарства, сваёй дзяржавы. Спашлёмся на аўтарытэтную крыніцу першай паловы XVI стагоддзя – Статут 1529 года, дзе словазлучэнне «рэч паспалітая» скрозь ужываецца ў значэнні «дзяржава», «гаспадарства», «краіна», напрыклад: у 10-м артыкуле раздзела I, 6-м артыкуле раздзела III, 2-м артыкуле раздзела IV. Тое ж паўтараецца і ў шматлікіх артыкулах Статутаў 1566 і 1588 гадоў.

Палякі гэтаксама здаўна карысталіся тэрмінам «рэч паспалітая» («rzecz pospolita») і да Люблінскага Сойму ўжывалі яго выключна як сінонім свайго гаспадарства, сваёй дзяржавы – Польскага Каралеўства. Аднак у 1569 годзе, у цяжкі для нашай Бацькаўшчыны момант, яны абвясцілі, што Вялікае Княства Літоўскае зліквідоўваецца як самастойная дзяржава, прылучаецца да Польшчы, і такім чынам утвараецца адна «рэч паспалітая» (дзяржава) – Польскае Каралеўства, што і было зафіксавана імі ў Заключным акце Люблінскага Сойму. Ад таго часу яны заўсёды пачалі гэтак гаварыць і пісаць, прызнаючы толькі адну «рэч паспалітую» – Польскую дзяржаву.

Вялікі князь Жыгімонт Аўгуст, за якім была падпісана Люблінская унія. Гравюра 1554 года.

Нашыя продкі так ніколі не лічылі. І так сапраўды ніколі не было. А тое, што Вялікае Княства Літоўскае заставалася юрыдычна незалежнай дзяржавай – Беларускай рэчай паспалітай да 3 траўня 1791 года і нават пазней, – доказ тэндэнцыйнасці польскай гістарычнай навукі. Да канца XVIII стагоддзя ў Вялікім Княстве Літоўскім дзейнічаў свабодны, выбарны заканадаўчы орган – Галоўны З'езд (Вальны Сойм); працаваў юрыдычна незалежны ўрад і мясцовая адміністрацыя; была свая ўстанова замежных спраў – Дзяржаўная Канцылярыя; існавала самастойная фінансавая і эканамічная палітыка; уласны дзяржаўны скарб; асобныя карныя структуры і вайсковыя фарміраванні; свая сістэма ганаровых званняў і пасад. А галоўнае, тут дзейнічалі ўласныя законы, сабраныя ў Статуце, якія якраз былі юрыдычным падмуркам незалежнага Беларускага гаспадарства.

Такім чынам, аніякага новага дзяржаўнага ўтварэння, што нібыта ўзнікла ў 1569 годзе і праіснавала да канца XVIII стагоддзя, уключаючы беларускія і польскія землі, не было. І да 1569 года і пасля яго існавалі дзве незалежныя дзяржавы – Польскае Каралеўства і Вялікае Княства Літоўскае, якія сапраўды мелі шчыльныя палітычныя кантакты, што выяўлялася пераважна ў дзвюх сферах: па-першае, спалучэнне ў адной асобе гаспадара Беларускай дзяржавы, які тытулаваўся «вялікім князем», [illegible] Соймах Вялікага Княства і Польшчы), па чарзе то ў адным, то ў другім гаспадарстве.

Вялікае Княства Літоўскае і Польшча нярэдка аб'ядноўвалі свае намаганні з мэтай супольных ваенных дзеянняў – абароны ад варожых нападаў ці здзяйснення буйнамаштабных кампаній, як, да прыкладу, паходаў на Маскоўшчыну ў 1609–1611 і 1617–1618 гадах.

Часам дзве суседнія дзяржавы ўзгаднялі і свае дзеянні ў замежнай палітыцы, развязвалі агульныя дыпламатычныя задачы.

Але палітычныя, вайсковыя і дыпламатычныя хаўрусы зусім не азначаюць, што нейкае з гаспадарстваў у выніку перастае існаваць. На працягу доўгага часу блізкія ўзаемныя стасункі былі ў аднолькавай ступені вельмі выгадныя абедзвюм дзяржавам.

Менавіта вайскова-палітычны хаўрус «абодвух народаў», іх «агульныя справы» ў XVII–XVIII стагоддзях сапраўды называліся «Рэчай Паспалітай Абодвух Народаў», што і дало падставы пазнейшым гісторыкам гаварыць пра існаванне нібыта адзінай дзяржавы. Але гэтае сцвярджэнне не адпавядае гістарычным рэаліям. Што ж да магчымасці ўжывання словазлучэння «рэч паспалітая» (у сэнсе «дзяржава», «гаспадарства») сёння, то, каб пазбегнуць тэрміналагічнай блытаніны і, нарэшце, захаваць навуковы падыход да гістарычных з'яваў, варта было б пісаць: Польская рэч паспалітая як сінонім Польскага Каралеўства і Беларуская рэч паспалітая як сінонім Вялікага Княства Літоўскага.

Іван САВЕРЧАНКА.

Тэкст да ілюстрацыі падрыхтаваў Зміцер САНЬКО.

ЧУЛІ?

Крымінальная справа Міхалевіча прыпынена

«Мне прыпынілі крымінальную справу. Не спынілі, а прыпынілі, – напісаў экс-кандыдат у прэзідэнты па выбарах 2010 года Алесь Міхалевіч у сацыяльных сетках. – Аўтаматычна адменена падпіска пра нявыезд, але застаюся ў статусе абвінавачанага. Следчыя дзеянні больш не вядуцца, але справу могуць аднавіць у любы момант».

Як вядома, пасля Плошчы 19 снежня 2010 года Міхалевіч, як і большасць іншых кандыдатаў у прэзідэнты, быў затрыманы і змешчаны ў СІЗА КДБ. 19 лютага 2011 года яго выпусцілі пад падпіску аб нявыездзе, а ў сакавіку таго ж года ён выехаў з Беларусі.

8 верасня 2015 года Міхалевіч вярнуўся ў Беларусь.

ПАД ГРАДУСАМ

Новы рэкорд анамальнасці

Люты 2016 года стаў самым цёплым месяцам на Зямлі за ўсю гісторыю назіранняў, паведамілі эксперты НАСА, прааналізаваўшы дадзеныя, атрыманыя з касмічных спадарожнікаў. Сярэдняя тэмпература на паверхні Зямлі ў лютым была на 1,35 градуса па Цэльсіі вышэй, чым сярэдняе значэнне для дадзенага месяца за кантрольны перыяд з 1951-га па 1980 год. Гэта азначае, што тэмпературнае адхіленне ад нормы стала самым значным за ўвесь час навуковых метэаназіранняў, то бок з 1880 года.

У выніку люты пабіў папярэдні рэкорд анамальнасці, які належыць студзеню 2016 года.

ЗА КУБАЧКАМ КАВЫ З МАРЫНАЙ КОКТЫШ

Мікалай КІРЫЧЭНКА:

«Не люблю кланяцца»

За некалькі гадзін мы паспелі абмеркаваць не толькі чатыры ягоныя шлюбы, але і хваробы, пенсію, тарыфы на паслугі ЖКГ і апошнія прэм'еры. Заўтра, 16 сакавіка, народны артыст Беларусі Мікалай Кірычэнка святкуе 70-годдзе. На размову ён пагадзіўся з лёгкасцю і гэтак жа адказваў на пытанні.

KP.BY

ВІЗІТОЎКА

Мікалай Кірычэнка, народны артыст Беларусі.

Нарадзіўся ў Маладзечне.

Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. З 1971 года – у трупе Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

У 2005–2009 гады – генеральны дырэктар Купалаўскага тэатра.

Прафесар Акадэміі мастацтваў, выкладае на тэатральным факультэце.

Гаспадар метро

На трэці паверх у сваю грымёрку Мікалай Міхайлавіч падымаецца адным махам – без задыхання, практычна пераскокваючы цераз прыступку.

– Ліфтам наогул не карыстаюся, – *гаворыць ён.* – Апошні часам вагу набраў. Да таго ж я гатаваць люблю, і ў мяне атрымліваецца добра, ну і чарку перакуліць пад гэтую справу магу. Аднак справа нават не ў гэтым. Я ўвесь час потым пытаюся: «Ну як, смачна?» Разумееш, я эгаіст – мне падабаецца, калі мяне хваляць!

– Можа, таму і прафесію такую выбралі – з абавязковымі апладысментамі?

– Я студэнтам увесь час спрабую растлумачыць, што такое быць акцёрам. Зразумела, што папулярнасць прафесіі рэзка змянілася. І калі раней тэатральны інстытут быў адной з самых прэстыжных ВНУ, то цяпер ужо не.

Я з першага разу не паступіў – праляцеў. Удар для мяне быў страшэнны! Затое дома спакойна выдыхнулі: "Дзякуй Богу, пранесла!" Бацькі былі супраць майго выбару. Я, дарэчы, нават не магу сказаць, што прымусіла мяне пайсці на другі круг.

– Напэўна, вельмі хацелася быць артыстам.

– Не чакайце ад мяне фразы, што я з дзяцінства марыў пра тэатр. Не! Мяне проста жыццё прыбіла да сцэны. Дарэчы, у 16 гадоў я пайшоў працаваць на МАЗ слесарам кантрольна-вымяральных прыбораў. Тры гады адпрацаваў у энергалабараторыі. І атрымлівалася! У мяне наогул рукі растуць з таго месца, з якога трэба. А потым адзін таварыш запрасіў мяне ў тэатральную студыю. І там была такая асаблівая атмасфера аднадумства...

– А ніколі не шкадавалі, што столькі гадоў аддалі тэатру? Бо розныя былі часы...

– Дакладна ведаю, што мог бы быць класным электрыкам. Альбо ваенным, як бацька, – я нарадзіўся ў казарме, і мілітарызм жыве ўва мне па гэты дзень. Мог бы стаць выдатным поварам – ужо меў бы свой рэстаран! Але я не шкадую, што стаў менавіта артыстам. Для бацькоў мой выбар, вядома, стаў трагедыяй. А для мяне...

Тэатр – гэта жудасны наркотык, гэта асаблівая атмасфера. І калі сюды ўжо трапіў, то выйсці амаль немагчыма. Памятаю, адзін мой калега расчараваўся ў тэатры і сышоў на завод. Але доўга не вытрымаў – вярнуўся. Таму што калі ты ўдыхнуў на поўныя грудзі пах куліс, калі выйшаў на сцэну і адчуў падзяку залы – усё, ты раб гэтай справы!

– Мікалай Міхайлавіч, а як гэта вы, народны артыст, да гэтага часу на грамадскім транспарце? Чаму не на сваёй машыне?

– Я жыву на Аўтазаводзе – мне на метро вельмі зручна. Калі быў дырэктарам тэатра, у крайніх выпадках карыстаўся службовым аўто.

– А на лецішча на метро не даедзеш...

– Яшчэ не так даўно дабіраліся на электрычцы, а там ад станцыі хвілін сорак яшчэ ісці ў добрым тэмпе. Таму машыну ўсё-ткі набылі. Але я за руль не саджуся – толькі жонка. У мяне і вадзіцельскага пасведчання няма. Я чалавек нервовы, не люблю, калі мяне абганяюць, падразаюць...

Аднойчы смешны выпадак быў. Пасля спектакля, як звычайна, спускаюся ў метро. І ўжо ў цягніку да мяне падыходзіць нейкі мужчына і здзіўлена пытаецца: вы што, сапраўды ўвесь час на метро ездзіце, у вас няма сваёй машыны?! Я яму адказаў: маўляў, толькі паміж намі, метро – гэта мая прыватная ўласнасць. Больш пытанняў ён не задаваў.

На пенсію – толькі наперад нагамі

– А як вам з цяперашнім мастацкім кіраўніком Мікалаем Пінігіным працуецца? Пытаюся таму, што ў апошні час у яго агарод камень не кідае толькі лянівы...

– З Пінігіным мы працуем ужо шмат гадоў. У яго ж два перыяды працы ў Купалаўскім: да пераезду ў Расію і пасля сыходу з БДТ. Раней роляў было больш, а цяпер з-за ўзросту ўжо складаней разлічваць на месца ў рэпертуары.

– Перажываеце гэты момант?

– Вядома, гэта вельмі цяжка. Яшчэ хочацца трапятацца, але... Я хвараваў стаўлюся, напрыклад, да некаторых размеркаванняў. Калі падыходзіш да дошкі загадаў, адразу шукаеш сваё прозвішча і толькі потым ужо глядзіш, якую ролю табе далі. І калі не знаходзіш...

– Нервуецеся?

– Адно з нядаўніх размеркаванняў я ледзь перажыў. Шчыра кажу: мне дрэнна стала. Я вельмі чакаў і спадзяваўся, што буду граць п'есу, якая вельмі блізкая па духу маёй акцёрскай школе, майму псіхалагічнаму разуменню тэатра. Я не хвалююся, калі мне не даюць ролю, звязаную з вакалам, – у мяне з гэтым заўсёды было складана. А калі адчуваеш, што гэта тваё, а яно пралятае міма...

– А калі вам прапануюць ролю без слоў, зусім не прэстыжную, эпізод?

– Нават калі малады рэжысёр скажа, што я павінен буду на сцэне проста адзін раз махнуць галавой і пасля гэтага павольна сысці – пагаджуся. Клянуся! Гэта не прыгожыя словы. Гэта такая прафесія.

Я заўсёды быў максімалістам. На сцэну выходзіў ва ўсіх станах – як бы кепска ні было. За ўсё жыццё з-за мяне адмянілі толькі адзін спектакль – я ўжо ніяк не мог прыйсці, бо ляжаў на аперацыйным стале. На наступны дзень пасля аперацыі я закруціўся эластычным бінтам, каб катэтар не выпаў, і пад абураныя крыкі медсястры паехаў на спектакль. Яшчэ партнёра папярэдзіў: толькі не закрані выпадкова на сцэне гэтае месца, там рана адкрытая. Вядома, ён трапіў... І я ледзь не завыў ад болю... Я не кажу, што такой самаадданы, герой. Проста гэта элемент прафесіі. Наогул, у акцёрства трэба ісці таму, хто гатовы памерці на сцэне.

Калі ў мяне заўтра спектакль і мне дрэнна, я не выклікаю "хуткую", бо баюся прапусціць чарговую сустрэчу з гледачамі.

Неяк іграў «Чорную панну Нясвіжа» з разрэзаным пальцам на назе – якраз у дзень спектакля маніпуляцыю правялі ў бальніцы. Апрануў касцюм, боты, а ісці не магу – боль пякельны! Прыйшлося цягаць нагу па сцэне. Спачатку думаў: адыграю напаўсілы, тым больш неважнецкі сябе адчуваю. А ўнутраны эгаізм кажа: «Ага, а потым хто-небудзь з публікі скажа: прамямліў нешта няўцямнае са сцэны, артыст называецца!» Таму я кожны раз на поўную катушку выкладваюся. Канешне, заўсёды можна знізіць градус існавання на сцэне. Але хтосьці гэта абавязкова заўважыць. І потым сорамна будзе.

– Чула гісторыю, што вас аднойчы ледзь не з міліцыяй хацелі ў бальніцу пакласці, а вы ўсё роўна на сцэну выйшлі.

– Гэта быў страшны выпадак. Я захварэў на сальманелёз. А гэтая хвароба, калі хто ведае, смяротна небяспечная і вельмі цяжка працякае. Выйшаў на сцэну і раптам бачу, што ў мяне зала паплыла. А да гэтага ўсё нармальна было, лёгкае недамаганне – не ў разлік. І ведаеш, пра што я падумаў у той момант? Як роўна сысці са сцэны. Таму што, калі пахіснуся, публіка вырашыць, што я нецвярозы.

– Спектакль дайгралі?

– Вядома! Потым ужо лекарам здаўся. Доктар сказаў: зараз за вамі прышлём машыну з інфекцыйнай бальніцы. А ў мяне заўтра спектакль. І я схаваўся. Дык лекары да мяне дадому з міліцыяй прыходзілі! Калі праз некаторы час я сустрэў аднаго з гэтых дактароў, ён шчыра здзівіўся: «Вы жывы?!»

У мяне ў той час было 18–20 спектакляў у месяц. Ніколі і падумаць не мог, што надыдуць дні, калі па тры-чатыры дні не трэба будзе прыходзіць у тэатр...

Я люблю, калі мне апладзіруюць, але не люблю кланяцца. Гэта ўсе ведаюць – я збягаю з паклону. Вось днямі ў мяне была антрэпрыза «Скупы» ў Сучасным мастацкім тэатры. Для мяне гэты спектакль заўсёды свята – там ёсць што іграць. І ў апошні раз неяк усё настолькі ўдала прайшло, што ў канцы спектакля ўся зала дружна выбухнула: «Брава!!!» А ты кажаш, ці расчараваўся ў прафесіі... Ды дзеля гэтага жывеш! Не веру я, калі артысты кажуць, што спакойна да гэтага ставяцца...

– Ваш сусед па грымёрцы Аўгуст Мілаванаў у адным са сваіх інтэрв'ю сказаў: *"Не магу глядзець, як артыст ужо не можа, а яшчэ карачыцца на сцэне. Гэта такое вартае жалю відовішча... Трэба сыходзіць своечасова, каб цябе запомнілі такім, якім ты сам сабе падабаўся".* Вы неяк плануеце свой сыход з тэатра?

– Мілаванаў – мудрэц, я яго заўсёды любіў і люблю. Ён вельмі разумны і таленавіты. Так здарылася, што ён пайшоў з тэатра. Мог бы вярнуцца – мы да гэтага часу ўспамінаем яго «Памінальную малітву». Але ён вырашыў, што дарогі назад няма. У гэтым яго мудрасць і сіла.

– Не ўсе так могуць.

– Я нядаўна быў у райсабесе, і супрацоўніца, якая вырашала маё пытанне, сказала: *"Вы ж даўно можаце на пенсію пайсці, навошта вам гэтая праца?!»* Я адказаў, што ў нашай прафесіі на пенсію не сыходзяць – нас проста выносяць. Пакуль можаш – трэба працаваць. І неабходна мілаванаўская мудрасць, каб зразумець: твой час сышоў.

А наогул, мяне заўсёды здзіўляе, з якой лёгкасцю людзі, седзячы на канапе, асуджаюць іншых. А тое, што ў свеце адбываецца, – гэта часцей за ўсё іх не датычыцца. Затое ў нас ваду гарачую адключаць – гэта ўжо трагедыя!

Проза жыцця

– Дарэчы, пра ваду. Як адрэагавалі на павышэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі?

– Жонка сказала, што для кашалька гэтыя тарыфы сталі вельмі адчувальныя. Але паабяцалі ж, што пералічаць...

У мяне ёсць сябар, ён авіятар, жыве ў Сербіі. І калісьці даўно, калі на нейкай нарадзе казалі пра тое, што дзяржава датуе нешта там на 80 працэнтаў, а насельніцтва толькі 20 працэнтаў пакрывае, ён устаў і сказаў: дык адкуль дзяржава бярэ грошы на датацыі?

– Ясная справа: з нашай з вамі кішэні.

– І нам сёння кажуць, што вялікую частку камуналкі за нас аплачвае дзяржава. Дык а што такое дзяржава і бюджэт? Адкуль гэта ўсё? Я разумею, калі б гэта Абама дасылаў...

Не хачу быць злым і казаць, што кошты высокія ў крамах, што грошай мала. Я стараюся зразумець, чаму так адбываецца. А яшчэ, калі выношу смецце, мне хочацца на кантэйнерах павесіць аб'яву, у якой вялікімі літарамі будзе напісана: *«Беларусы, вы ніколі не будзеце жыць добра, таму што не можаце нават адсартаваць свае адходы!»* Абурацца высокімі коштамі мы ўмеем, а ўнесці свой маленькі ўклад у паляпшэнне жыцця – не.

Вядома, жыць стала больш складана. Я не галадаю. Мяне больш хвалюе становішча маладых артыстаў. Ім неверагодна складана! Трэба плаціць за арэнднае жыллё, гадаваць дзяцей, а ў тэатры ніколі не было багатага жыцця. І не толькі акцёрам – дактарам, настаўнікам таксама складана. А гэта людзі, ад якіх залежыць будучыня нацыі!

Памятаю, даўным-даўно, калі ў тэатрах яшчэ была палітгадзіна (прасцей было прапусціць рэпетыцыю, чым не пайсці на гэта мерапрыемства), адна лектарка на пытанне аб тым, чаму ў тэатрах невысокія зарплаты, адказала: *"Вы ж не ствараеце матэрыяльныя каштоўнасці!»* Я тады ўстаў і сказаў: *«Вы не разумееце галоўнага: мы фарміруем тых, хто стварае матэрыяльныя каштоўнасці».*

– Дарэчы, пра каштоўнасці. Як вы паставіліся да прысуду акцёру Арцёму Бародзічу, якога нядаўна асудзілі на пяць гадоў за наркотыкі? Многія купалаўцы прыйшлі ў залу суда, каб падтрымаць яго...

– Мяне насцярожыла такое вельмі актыўнае дзеянне праваахоўных органаў у дачыненні да яго. Не думаю, што ён нават блізка падышоў да наркабаронства. Па-чалавечы магу сказаць проста: дурань. Трэба табе скінуць стрэс – выпі гарэлкі, навошта станавіцца на гэтую небяспечную сцежку, тым больш першы званок з судзімасцю ўжо быў?

Але браць яго, як асабліва небяспечнага злачынцу, спецназам... Ці была ў гэтым такая неабходнасць? Мне здаецца, гэта як мінімум нерэнтабельна...

Права на каханне

– Мікалай Міхайлавіч, вы былі жанаты чатыры разы. З былымі жонкамі падтрымліваеце адносіны?

– Так. Расставацца заўсёды трэба нармальна. Гэта жыццё. І нават калі нешта не склалася, паўсталі ўзаемныя прэтэнзіі – ну нельга сваё мінулае штурхаць нагамі і мазаць брудам!

– А чаму распадаліся вашы шлюбы? Улюбляліся і сыходзілі? Або віной усяму побыт?

– Ды розныя прычыны былі. Першы раз захапіўся іншай... Але не думаю, што ва ўсіх маіх былых жонак ёсць да мяне глабальныя прэтэнзіі як да чалавека. Першую жонку я даўно не бачыў, але, калі сустракаліся, нармальна размаўлялі. І нават пасля таго, як я з'ехаў з Брэста ў Мінск, у нас не было ніякіх гучных высвятленняў адносін, ніхто адзін аднаго брудам не паліваў.

Я ўвогуле не разумею мужчын, якія дрэнна кажуць пра сваіх былых жонак ці жанчын. Ты ж з ёй жыў, цалаваў, спаў...

Зрэшты, у мяне таксама быў адзін такі развод – ну проста страшны для мяне...

– Вас кінулі ці вы сышлі з сям'і?

– У жонкі ўзнікла іншае жыццё. А я не хацеў яе адпускаць, упіраўся. Гэта быў адзін з самых складаных перыядаў для мяне. Я нават заікацца стаў. У запой магутны сышоў. З часам, вядома, усё прайшло...

– Ваша цяперашняя жонка маладзей вас больш як на 20 гадоў. Вы яе не раўнуеце?

– Я вельмі раўнівы! Магу нават раўнаваць жанчыну, з якой калісьці быў блізкі. Мне непрыемна бачыць яе з іншым мужчынам.

А жонка падставы для рэўнасці не дае. Дарэчы, менавіта з-за розніцы ва ўзросце я баяўся браць шлюб, доўга супраціўляўся. Яна, калі даведалася, што цяжарная, сама спыталася: «Мікалай Міхайлавіч, вы думаеце са мной ажаніцца?»

– А хто ў вас у сям'і галоўны?

– Дачка. Ёй у гэтым годзе 20. Яна лідар па натуры і, калі прыязджае, хутка рэгулюе ўсе нашы сямейныя бязладзіцы.

– Яна, калі не памыляюся, у Штатах жыве?

– У Балгарыі. Паступіла ў амерыканскі ўніверсітэт.

– Не баяліся так далёка яе адпускаць?

– А яна нікога не пыталася. Вядома, страшна за яе. У той жа час Кіра з самага дзяцінства вельмі самастойная.

– Ведаю, што яна яшчэ школьніцай іграла ў некаторых спектаклях Купалаўскага, потым сцэнарыі пісала. А чаму не пайшла па вашых слядах?

– Яна ў 7 або 8 гадоў катэгарычна заявіла: ніколі не буду артысткай! Каб мне ўвесь час указвалі, дзе стаяць і што казаць, – ні за што!

Зараз займаецца эканомікай, захапілася крыптааналізам.

Мы ўвесь час думалі, што яна ў нас гуманітарый. А яна ў 9-м класе пайшла на фізмат. Мы былі ў шоку...

– У вас дачка нарадзілася, калі вам было трошкі за 50. Кажуць, што познія дзеці дораць асаблівыя адчуванні...

– Мы сто разоў з жонкай разбегліся б, калі б не яна. Я складаны чалавек, вельмі эмацыянальны. А дачка – яна не дае нам рабіць глупствы.

– Чула, у вас было вельмі незвычайнае вяселле...

– Мы прыехалі ў загс на тралейбусе. Я вярнуўся з прагулкі з сабакам і паехаў, як быў – у цёплым працоўным бушлаце. Прыехалі ў загс, распісаліся.

– Ведаю, што вакол вас заўсёды было нямала жанчын. Вы даражыце сямейнай утульнасцю, якую цяпер маеце?

– Я разумею, што ўжо час збіраць камяні. І ведаю, які наганяй атрымаю ад дачкі, калі раптам што. Але ж ніхто не можа загадваць наперад. І штамп у пашпарце – гэта не гарантыя вечнага сямейнага жыцця. Проста ў маім узросце ўжо ўсё складаней: няма ўжо той энергетыкі, абаяння, што раней...

– Ды ладна вам!

– Я памятаю параду аднаго рэжысёра... Я быў жанаты, у мяне было дзіця і раман на баку. І ён, бачачы, як я пакутую, сказаў: «Дзіця вырасце, а ты ўсё жыццё будзеш сябе дакараць, што не рашыўся на нейкі вельмі важны крок у жыцці». І ён меў рацыю...

Таму я лічу, што ў любога чалавека павінна быць права закахацца і, можа, пачаць новае жыццё... У любы момант у і ў любым узросце.

Самае галоўнае

– Мікалай Міхайлавіч, а як у вас узаемаадносіны з узростам? Адчуваеце, што старэеце?

– Калі называеш гэтую страшную лічбу, усярэдзіне ўсё сціскаецца... *(Смяецца.)*

– Дзесяць гадоў таму, напярэдадні свайго юбілею, вы сказалі: *"Я вось аглядваюся назад і разумею, што і дрэвы саджаў, і няхай не пабудаваў дом, дык адрамантаваў кватэру, і дзеці ў мяне ёсць, і работа... Аднак спыняцца нельга. Гэта і ёсць рухавік творчасці і жыцця – і ў 30 гадоў, і ў 40, і ў 60, і, каму пашанцуе, у 70–80 павінна быць перспектыва".* Сёння ў вас яна ёсць?

– Ёсць. Я яшчэ спадзяюся быць запатрабаваным у тэатры.

Яшчэ бачу перспектыву ў сваіх вучнях, якіх імкнуся навучыць усяму, што ведаю сам. Дарэчы, многія з іх ужо даволі паспяховыя.

– Мікалай Міхайлавіч, а што самае галоўнае ў жыцці? Гэта можна зразумець за 70 гадоў?

– Галоўнае?..

Хочацца, каб цябе памяталі. Па-сапраўднаму, шчыра...

Я калі дырэктарам быў – здавалася: мяне ўсе любяць, хочуць сябраваць. А калі пазбавіўся пасады – вакол такая страшная пустэча ўтварылася...

Таму мне прыемна, калі тая ж Света Бароўская едзе на машыне, бачыць мяне, рэзка тармозіць на перакрыжаванні і крычыць: «Добры дзень, настаўнік!» Калі вучні, з якіх ты нутро падчас вучобы даставаў і слязу выціскаў, кажуць «Дзякуй вам за ўсё!», эсэмэскі ўдзячныя дасылаюць...

...Увечары Мікалай Кірычэнка патэлефанаваў мне і задаволеным голасам сказаў:

– Ведаеш, я цяпер згатаваў такое рагу – пальчыкі абліжаш! Сяджу, кармлю жонку з лыжачкі, яна ўсміхаецца і ў захапленні прыгаворвае: «Як смачна!» І я шчаслівы. І яна шчаслівая. Вось гэта, напэўна, і ёсць галоўнае...

СОВЕРШЕННО СЕКРЕТНО

Кто такой Владимир Скуловец?

И за что ему дали орден Отечества III степени?

В конце минувшей недели А.Лукашенко подписал указ о награждении орденами и медалями работников государственных органов. Среди них – помощник управляющего делами президента Владимир Скуловец. Он получил орден Отечества III степени.

В свое время Владимир Скуловец возглавлял одну из самых закрытых спецслужб Беларуси, а патронировал ее небезызвестный **Виктор Шейман**, которого подозревают в причастности к организации похищений и устранений **Юрия Захаренко, Виктора Гончара, Анатолия Красовского** и **Дмитрия Завадского**.

Как уже не раз сообщалось в прессе, о деятельности данного подразделения широкая общественность впервые узнала накануне президентских выборов 2001 года. Тогда многие независимые средства массовой информации опубликовали анонимное письмо от сотрудников КГБ, информирующее о существовании в Беларуси спецслужбы, которую назвали «эскадроном смерти». В перечень задач спецподразделения входили: *«агентурно-оперативная работа, в том числе и среди оппозиции, фиксация мероприятий и публичных акций, проводимых противниками режима, негласное наблюдение за наиболее активными представителями демократической общественности, сбор компромата и информации по деятельности всех оппозиционных партий, проверка лояльности к существующей вертикали власти и прочее».*

Первым руководителем этой спецслужбы был бывший сотрудник управления государственной охраны при Лукашенко подполковник **Николай Васильченко**. В деле громких исчезновений он играл далеко не последнюю роль. О нем в своем секретном рапорте на имя министра внутренних дел **Владимира Наумова** писал бывший начальник ГУКМ МВД РБ генерал-майор **Николай Лопатик**: *«Шейман В.В. дал указание Павличенко физически уничтожить бывшего министра внутренних дел Захаренко Ю.Н. Информационное обеспечение местонахождения Захаренко для действий Павличенко было обеспечено спецподразделением Васильченко Н.В., задание на которое ему также дал Шейман В.В. через своих сотрудников».*

Затем Васильченко отправили в отставку, а спецслужбой стал руководить бывший сотрудник Совета безопасности **Владимир Ткаченко.** Почти 10 лет назад он трагически погиб (?) в автокатастрофе – машина, которой он управлял, почему-то врезалась в столб в самом центре Минска. После этого секретное спецподразделение отдали в подчинение Владимиру Скуловцу.

За эти годы Скуловец стал, пожалуй, одним из самых доверенных лиц Виктора Шеймана, можно сказать, его правой рукой. Когда Шейман был госсекретарем Совета безопасности, Владимир Скуловец возглавил оперативный отдел госсекретариата. До него в этой должности работали **Юрий Сиваков, Владимир Ткаченко**. Скуловец был назначен начальником оперативного отдела после **Александра Орловского**, которого осудили за участие в насильственных действиях в отношении тогдашнего председателя Комитета госконтроля **Зенона Ломатя.** Верховный суд лишил Орловского свободы на два года.

Как только Виктор Шейман стал управляющим делами президента, Скуловец снова появился рядом. Те, кто служил вместе со Скуловцом или сталкивался с ним близко, отзываются о нем как о порядочном человеке.

Владимир Скуловец – полковник запаса. Срочную службу служил в Карелии. Базовое военное образование получил во Львовском высшем военно-политическом училище.

Владимир Скуловец – человек не очень публичный. Правда, несколько лет назад про него писала военная пресса. У Скуловца прекрасная семья, которой он очень дорожит, двое взрослых сыновей.

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

Для справки

Орден Отечества является высшим орденом Республики Беларусь. Он имеет три степени, самая высшая – первая. Орден Отечества I степени изготавливается из серебра с позолотой, II степени – из серебра с частичной позолотой, III степени – из серебра. Награждение производится последовательно орденом Отечества III, II и I степеней:

– за отличные достижения в производственной, научно-исследовательской, социально-культурной, общественной, благотворительной и иных сферах деятельности, направленной на повышение благосостояния людей и укрепление могущества страны;

– за мужество и отвагу, проявленные при защите Отечества и его государственных интересов, обеспечении законности и правопорядка;

– за большие заслуги в развитии экономических, научно-технических и культурных связей между Республикой Беларусь и другими странами.

Орден Отечества носится на левой стороне груди и при наличии других орденов располагается перед ними в порядке старшинства степеней.

ВІЗІТ

Міністр замежных спраў Польшчы наведае Беларусь?

У Вітольда Вашчыкоўскага беларускія карані – яго маці нарадзілася ў Ваўкавыскім раёне Гродзенскай вобласці.

Пакуль афіцыйна пра магчымы візіт кіраўніка МЗС Польшчы не паведамляецца. Аднак у польскіх СМІ са спасылкай на Вітольда Вашчыкоўскага з'явілася інфармацыя, што візіт у Беларусь плануецца на другую палову сакавіка. А яшчэ раней Вітольд Вашчыкоўскі падкрэсліваў, што пасля адмены санкцый Беларусь мае магчымасць вярнуцца на дарогу супрацоўніцтва з Еўрасаюзам і Польшча *"можа з'яўляцца пасрэднікам такога супрацоўніцтва".*

Пра свой маючы адбыцца візіт у Беларусь кіраўнік польскага МЗС сказаў так: *"Хачу, каб гэта не быў толькі куртуазны візіт на некалькі гадзін. Хачу паехаць самаходам, патрапіць у Мінск, у іншыя месцы, у якіх жывуць палякі ў Беларусі».* Міністр таксама хоча наведаць Ваўкавышчыну, дзе нарадзілася яго маці.

Ганна ГАНЧАРЫК.

СІТУАЦЫЯ

Хто падманвае?

То там, то там пачынаюць бунтаваць спартсмены: маўляў, за бясплатна яны гуляць не згодны… У той жа час афіцыйныя асобы сцвярджаюць, што ўсё няпраўда, заробкі выплачваюцца. Як жа так?

Нядаўна такая сітуацыя здарылася з брэсцкім валейбольным клубам "Прыбужжа", калі ў апошнім туры чэмпіянату Беларусі дзяўчаты з асноўнага складу клуба адмовіліся выходзіць на пляцоўку і за каманду гулялі маладыя валейбалісткі. Сваю "акцыю пратэсту" спартсменкі патлумачылі затрымкамі заробкаў.

У той жа час начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Брэсцкага гарвыканкама Анатоль Наскоў сцвярджае, што "затрымак з боку бюджэту па ўсіх выплатах гульцам, трэнерам, адміністрацыі не было ні на адзін дзень".

Хто ж падманвае?

Як высветлілася, ніхто. Справа ў тым, што ў брэсцкім валейбольным клубе гарантаваная стаўка заработнай платы – 1,8 мільёна рублёў. А потым на гэтую суму набягаюць розныя іншыя выплаты са спонсарскіх паступленняў. Пры аднолькавай стаўцы ў брэсцкіх спартсменак, па прызнанні кіраўніцтва клуба, "набягала" ад 5 да 14 мільёнаў рублёў у месяц. "Бюджэтная" частка заробку, як і кажуць чыноўнікі, выплачваецца. Праблема ў тым, што знікла значна большая спонсарская частка…

Алег СНОЎ.

Великий пост 2016: календарь питания по дням

Великий пост начинается сразу после Масленицы и заканчивается перед Пасхой. В 2016 году пост продлится с 14 марта по 30 апреля.

Суть Великого поста – очищение души и тела через самоограничения, в том числе и в плане питания. Это самый главный христианский пост, который еще называют "Четыредесятница". Установлен он в честь поста, который соблюдал Иисус Христос в пустыне в течение 40 дней, а его цель – подготовка к Пасхе.

Самой строгой является последняя неделя перед Пасхой – страстная седмица. В первый день после Масленицы Чистый понедельник, а также в Страстную пятницу верующие вообще ничего не едят. В другие дни постное меню составляется по этим правилам:

Понедельник, среда, пятница – сухоядение (продукты, которые не варились и не жарились – только хлеб, вода, овощи, фрукты, мед, сухофрукты).

Вторник, четверг – можно есть горячую пищу, но без добавления растительного и уж тем более сливочного масел.

Суббота, воскресенье – постная пища с растительным маслом.

В некоторые дни можно добавить в рацион рыбу. В 2016 году это будет 7 апреля (Благовещение) и 24 апреля (Вербное воскресенье). Кроме того, на 23 апреля выпадает Лазарева суббота, когда можно будет есть рыбную икру.

В Великий пост 2016 нельзя есть мясо и все производные, молоко и близкие к нему продукты, яйца, а также запрещено к употреблению спиртное.

Первая неделя

Понедельник 14 марта	Вторник 15 марта	Среда 16 марта	Четверг 17 марта	Пятница 18 марта	Суббота 19 марта	Воскресенье 20 марта
Полное воздержание от еды	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино

Вторая неделя

Понедельник 21 марта	Вторник 22 марта	Среда 23 марта	Четверг 24 марта	Пятница 25 марта	Суббота 26 марта	Воскресенье 27 марта
Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная растительная пища без масла	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная растительная пища без масла	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино

Третья неделя

Понедельник 28 марта	Вторник 29 марта	Среда 30 марта	Четверг 31 марта	Пятница 1 апреля	Суббота 2 апреля	Воскресенье 3 апреля
Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная растительная пища без масла	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная растительная пища без масла	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино

Четвертая неделя

Понедельник 4 апреля	Вторник 5 апреля	Среда 6 апреля	Четверг 7 апреля (Благовещение)	Пятница 8 апреля	Суббота 9 апреля	Воскресенье 10 апреля
Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная растительная пища без масла	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная пища с добавлением растительного масла, рыба, вино	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино

Пятая неделя

Понедельник 11 апреля	Вторник 12 апреля	Среда 13 апреля	Четверг 14 апреля	Пятница 15 апреля	Суббота 16 апреля	Воскресенье 17 апреля
Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная растительная пища без масла	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная растительная пища без масла	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино

Шестая неделя

Понедельник 18 апреля	Вторник 19 апреля	Среда 20 апреля	Четверг 21 апреля	Пятница 22 апреля	Суббота 23 апреля	Воскресенье 24 апреля (Вербное воскресенье)
Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная растительная пища без масла	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная растительная пища без масла	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Вареная пища с добавлением растительного масла, вино, икра.	Разрешается потреблять рыбу

Страстная неделя – строгая седмица Великого поста 2016, каждый ее день носит собственное название. Также следует отметить, что в Страстную неделю пост усиливается и является действительно строгим.

Понедельник 25 апреля (Страстной понедельник)	Вторник 26 апреля (Страстной вторник)	Среда 27 апреля (Страстная среда)	Четверг 28 апреля (Страстной четверг)	Пятница 29 апреля (Страстная пятница)	Суббота 30 апреля (Страстная суббота)	Воскресенье 1 мая (Воскресение Христово)
Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Полное воздержание от еды	Сухоядение (потребление хлеба, сырых овощей, фруктов, сухофруктов, меда, орехов)	Пасха, окончание Великого поста

СЛЫШАЛИ?

Польские визовые центры расширяют географию

На этой неделе, как и объявлялось ранее, в четырех городах Беларуси откроются польские визовые центры. С 16 марта заработают центры в Пинске и Барановичах, 17 марта – в Могилеве, а 18 марта – в Лиде. Как известно, получить там польскую шенгенскую или национальную визу можно по принципу «одного окна» за 15 евро по курсу Нацбанка – это стоимость услуги.

В Посольстве Польши в Минске напоминают также, что 18 марта визовый центр в Минске переедет в торговый центр «Галилео» по адресу: ул.Бобруйская, 6, что возле железнодорожного вокзала.

Адреса новых визовых центров:
г.Лида, ул.Радюка, 2А,
г.Пинск, ул.Первомайская, 176А,
г.Барановичи, ул.Кирова, 101/1,
Могилев, пр.Пушкинский, 35В-1,
Минск, ул.Бобруйская, 6 (ТЦ «Галилео»).

Как известно, польские визовые центры уже работают в Бресте, Гродно, Гомеле.

Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Андрэй АРАМНАЎ: «Алімпійскі чэмпіён працуе за 1 мільён 200 тысяч у месяц»

Пераможца Гульняў-2008 цяжкаатлет Андрэй Арамнаў распавёў "Народнай Волі" пра тое, чаму ён поўнасцю "завязаў" з вялікім спортам, як вырашыў трэніраваць дзяцей і колькі за гэта атрымлівае.



– Пасля таго як у мяне парваліся мышцы, аперацыі так і не дачакаўся, – *абураецца* ***Андрэй Арамнаў***. – Жыць з такой траўмай можна, але пра выступленні на высокім узроўні нават марыць ужо не даводзіцца. Таму з вялікага спорту сышоў канчаткова і зараз у спартшколе Барысава трэніраую дзяцей на палову стаўкі.

– Які заробак у алімпійскага чэмпіёна?

– 1 мільён 200 тысяч. Высокааплатнай работы мне ніхто не прапанаваў.

– Як жывяце за гэтыя грошы? У вас жа сям'я…

– А як астатнія беларусы жывуць на малыя заробкі? Тым не менш займацца з дзецьмі мне падабаецца. Не хачу, каб яны паўтарылі мой лёс. Мяне ж проста кінулі трэнеры, нават не вераць, што я атрымаў траўму, хоць я на "парванай"назе трэніраваўся. Нагрузкі пры гэтым наогул былі забаронены. А зараз такую аперацыю рабіць ужо позна. Урачы сказалі, што неабходна выразаць усе мае рубцы, а затым па-новаму іх зашываць. Я на такую аперацыю ў Беларусі не згаджуся.

– Колькі дзяцей вы трэніруеце?

– Траіх, бо я ж працую на палову стаўкі. У мяне да кожнага індывідуальны падыход. Некаторыя ў групу набіраюць 25 чалавек і трэніруюць натоўп, але гэта не мая методыка. Я не хачу грэх на душу браць, бо дзеці давяраюць свой час так званым трэнерам, а тыя нічога не могуць ім даць. Я зразумеў, што дзеці – маё прызванне. І таленты заўсёды ёсць! Галоўнае – знайсці іх і выхаваць.

– Можа быць, з часам вас перавядуць на поўную стаўку?

– Паабяцалі, што з верасня гэта можна будзе зрабіць, а да гэтага часу трэба працаваць "у агульным парадку". Сказалі мне: "Алімпійскім чэмпіёнам ты быў у мінулым". Вось так! Выціснулі з мяне ўсё, што можна, а зараз даводзіцца атрымліваць капейкі. Так і напішыце: "Адзіны ў гісторыі суверэннай Беларусі алімпійскі чэмпіён-цяжкаатлет працуе за 1 мільён 200 тысяч рублёў".

Алесь СІВЫ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл. рэкламнага аддзела:
(017) 3286609
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info



Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, правa ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 14.03.2016 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 26 125 экз. Заказ № 894